Іван Крук

кандыдат філалагічных
навук, дацэнт,
рэктар Інстытута культуры
Беларусі (г. Мінск, Беларусь)



# Інстытут культуры Беларусі: гісторыка-культурны кантэкст, стратэгіі развіцця

## 1. Некалькі гістарычных рэтраспекцый

Шмат гадоў таму здарылася так, што з невялікім інтэрвалам часу мне пашчасціла апынуцца ў сутарэннях Полацкай Сафіі, а затым у скляпенні Фарнага касцёла ў Нясвіжы. Спалучэнне гэтых двух, здавалася, будзённых фактаў справакавала філасофскія разважанні аб лёсе нашай краіны і людзях, якія стагоддзямі жылі на гэтай гаротнай, але шчаслівай зямлі. З аднаго боку, Нясвіжскі касцёл стаў апошнім прытулкам шматлікіх пакаленняў магутнага роду Радзівілаў, вакол якога да сённяшняга часу віруе мноства тайн і легенд, аднак і матэрыяльнае багацце і духоўны куфэрак роду цешыць вока яго замежным уладальнікам. З другога боку, з трох вядомых ва ўсходніх славян Сафійскіх сабораў (у Ноўгарадзе, Кіеве і Полацку) менавіта беларускі аказаўся на ўскрайку духоўнага жыцця той часткі народа — крывічоў, якая некалі вылучалася не толькі найвышэйшай пасіянарнасцю ў палітыка-эканамічных здабытках, але найперш выключным мастацкім талентам і фенаменальнай духоўнай крэатыўнасцю? Пасля гэтага неаднаразова выплываў з небыцця ні то гістарычны фаталізм, ні то нябесная наканаванасць тых падзей, артэфактаў, з якімі некалі сутыкаліся нашы далёкія продкі, а таксама ўжо наша пакаленне: чаму так склаўся лёс некалі магутнай Рымскай імперыі, у чым тайна кароткай, але вельмі насычанай падзеямі гісторыі Савецкай дзяржавы?



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Чаму сталася так, што старажытныя цэнтры фарміравання нашай дзяржаўнасці — Полацк, Навагрудак, Тураў, Друцк — з цягам часу саступілі месца прыцяжэння іншым, больш маладым гарадам?

Калі асноўныя тэарэтычныя пастулаты Л. Гумілёва (пасіянарная энергія этнасу набірае сваю моц, дасягае найвышэйшага развіцця і канчаткова згасае, ператвараючы этнас у зусім іншае сацыякультурнае фарміраванне з цыклічнасцю ў 1200 гадоў) перакласці на матрыцу гісторыі беларускага народа, то становіцца не зусім зразумела, чаму адбылося так, што менавіта беларуская зямля аказалася не толькі апошнім фарпостам на шляху татарскай Арды, але і прытулкам для тысяч татараў, якія браліся нашымі найбольш знатнымі родамі на воінскую службу, а затым аселі і ператварыліся ў тутэйшых земляробаў, людзей, якія займаліся традыцыйнымі промысламі і рамёствамі, якія абагацілі нашу нацыянальную культуру надзвычай цікавай літаратурнай спадчынай — кетабамі? Тысячы рускіх стараквераў шукалі месца на гэтай зямлі, каб захаваць дарэформеннае праваслаўе, і зноў-такі беларуская зямля прыйшлася ім даспадобы і дала магчымасць да сённяшняга часу падтрымліваць сваю тысячагадовую традыцыю. Яны канцэнтравана жылі на Віцебшчыне, Гомельшчыне і Магілёўшчыне. Напрыклад, да сённяшняга часу ў Кіраўскім раёне старaверы жывуць у дванаццаці вёсках, практычна не ўступаючы ў шлюб з карэнным беларускім насельніцтвам, захоўваюць старыя традыцыі, вядуць родавыя кнігі, сілкуюцца толькі сваімі стравамі, якія шмат у чым адрозніваюцца ад традыцыйных беларускіх. А тым часам тысячы і тысячы сыноў і дачок нашага народа нарадзіліся на Беларусі, але жылі і працавалі практычна па ўсім свеце, пакінуўшы значны след у гісторыі сусветнай цывілізацыі. Нашы продкі сплаўлялі лес па Дняпры аж да Чорнага мора, большасць з іх вярталася дадому, але знаходзіліся і такія, якія назаўсёды заставаліся ў іншаземных краінах. Вялікая колькасць нашага люду шукала шчасце і імкнулася зарабіць грошы ў ЗША, Канадзе, краінах Паўднёвай Амерыкі, Аўстраліі, каб вярнуцца і набыць ладны кавалак роднай зямлі. Пазней цэлыя вёскі былі пераселены ў Заходнюю Сібір, дзе сёння жыве ўжо трэцяе пакаленне тых перасяленцаў, якія да гэтага часу ідэнтыфікуюць і пачуваюць сябе беларусамі.

Такая ж гісторыя працягвае стварацца на нашых вачах і нашымі рукамі. Рэарганізуюцца адны, ствараюцца іншыя, зліваюцца ў адно цэлае, а затым падзяляюцца ў дзве самастойныя ўстановы, арганізацыі, асацыяцыі, міністэрствы, камітэты… За кожнай арганізацыяй стаіць той жа Небам наканаваны Лёс, педагагічныя і навуковыя школы, калектывы,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

якія ствараюцца, фарміруюцца, становяцца прыкметнай з’явай ў жыцці дзяржавы або грамадства. Заўсёды знаходзіцца чалавек, які зможа генерыраваць ідэю, захапіць ёю адпаведныя органы ўлады, вылучыць фінансаванне, знайсці будынак і аб’яднаць вакол сябе людзей, здольных трансліраваць абазначаную ідэю і стаць прыдатным для той ці іншай галіны дзяржаўнага будаўніцтва. Аднак праз нейкі час знаходзіцца іншы чалавек, які з той жа актыўнасцю і перакананасцю будзе сцвярджаць адваротнае або пераконваць у неабходнасці прынцыповых змен. Гэтыя сацыяльныя ўтопіі, толькі не ў маштабах пабудовы Савецкага Саюза, а ў непараўнальна меншых маштабах, мелі непасрэднае дачыненне і да Дзяржаўнай установы адукацыі, якая зараз мае ёмістую па змесце назву «Інстытут культуры Беларусі».

2. Сацыякультурныя ўтопіі ў кантэксце беларускай ментальнасці

У 1991 г. на падставе аб’яднання трох рэспубліканскіх метадычных установаў быў створаны Беларускі дзяржаўны інстытут праблем культуры, які паступова заняў сваю культурную нішу і стаў важным навукова-метадычным цэнтрам у Рэспубліцы Беларусь. Пад кіраўніцтвам У. П. Скараходава інстытут стаў вядомай навукова-даследчай і вучэбна-метадычнай установай, на базе якой штогод праходзілі павышэнне кваліфікацыі кіраўнікі і спецыялісты галіны культуры. Асаблівая ўвага надавалася збіранню і вывучэнню традыцыйнай духоўнай спадчыны беларускага народа, педагагічнай дзейнасці сярэдніх спецыяльных установаў галіны культуры, даследаванню працэсаў у прафесійным мастацтве краіны.



Аднак у 2008 г. пачала распаўсюджвацца ідэя аб стварэнні ўніверсітэта, які структурна нагадваў бы большасць еўрапейскіх прэстыжных універсітэтаў, якія аб’ядноўваюць у сабе і вышэйшую навучальную ўстанову, і цэнтр павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў галіны культуры, і навукова-даследчы інстытут, які б займаўся даследаваннямі ў галіне прыкладной культуралогіі і адначасова выконваў функцыю галіновага інстытута са сваімі спецыфічнымі функцыямі падрыхтоўкі канцэптуальных, метадалагічных праектаў, вучэбна-метадычных комплексаў, аналітычна-прагнастычных запісак, правядзення сацыялагічных даследаванняў, якія б дапамагалі Міністэрству культуры выпрацоўваць галіновыя або рэспубліканскія праграмы, разлічаныя на бліжэйшую перспектыву. Такі варыянт сацыякультурнай і навукова-педагагічнай утопіі вырашана было зрабіць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

на базе Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў з далучэннем да яго Беларускага дзяржаўнага інстытута праблем культуры. За даволі кароткі час кіраўніцтва галіновага міністэрства зразумела, што ў нашых умовах і ў цяперашні час такая мадэль сябе не спраўдзіла. Мы даволі часта спасылаемся на вопыт замежных краін, звяртаючы ўвагу на моцныя бакі іх дзейнасці, але не ўлічваем масу сумежных акалічнасцей і найперш вопыт эканамічных адносін у краіне і спецыфіку фінансавання цэнтраў, якія займаюцца фундаментальнымі даследаваннямі, а ўспрымаем толькі верхнюю частку айсберга, не разумеючы агульны кантэкст развіцця ўстановы. І тады прыгожая па форме, адпрацаваная па структуры, эфектыўная па выніках дзейнасці мадэль заходнееўрапейскай канфігурацыі практычна не апраўдвае сябе ва ўмовах нашай сацыяльна-эканамічнай рэчаіснасці. Вынік прадказальны — былой установы не стала, знікла створаная школа, спецыялісты-прафесіяналы апынуліся ў іншых месцах, а актуальныя функцыі дадатковай адукацыі дарослых і галіновага інстытута застаюцца і патрабуюць неадкладнага вырашэння. Культурная сфера жыццядзейнасці грамадства жыве па сваіх законах і патрабуе неадкладнага паўсядзённага клопату. Гэта складаны сацыякультурны механізм, у якім пастаянна віруюць актыўныя, дынамічныя працэсы, іх неабходна не толькі адсочваць, аналізаваць і рабіць прагноз на заўтрашні дзень, але яшчэ і прадбачыць іх на некалькі крокаў наперад.

Сітуацыя вымагала рашучых захадаў. Міністр культуры П. П. Латушка выйшаў ва Урад Рэспублікі Беларусь з прапановай аб утварэнні новага інстытута, які б выконваў шэраг арганізацыйных, адукацыйных, каардынацыйных і аналітычных функцый і ў пэўнай ступені аднавіў традыцыі, якія некалі склаліся ў БелДІПК. 13 снежня 2010 г. такая ўстанова была створана, яна атрымала выключную па сваёй задуме назву — дзяржаўная ўстанова адукацыі «Інстытут культуры Беларусі». Скарочаная назва інстытута была прапанавана ў наступнай рэдакцыі: «Інбелкульт». Кожны, хто сутыкаецца з гэтай лексічнай неадпаведнасцю, правамерна задае пытанне, міжволі ўзгадвае адпаведныя гістарычныя паралелі. Чаму скарочаная назва змяшчае намінацыйна пазнавальныя часткі кожнага слова, але ў нечаканай інверсійнай паслядоўнасці? Адукаваны чалавек, знаёмы з гісторыяй развіцця навукі на Беларусі, тут жа ўзгадае, што скарочаная назва «Інбелкульт» прыйшла да нас з пачатку 20-х гг. мінулага стагоддзя. У 1922 г. пастановай СНК БССР створаны Інстытут беларускай культуры, які праіснаваў да 1927 г., а на пачатку наступнага на яго базе былі арганізаваны некалькі



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

інстытутаў, якія сталі навуковай асновай фарміравання Акадэміі навук. Чаму раптам або наадварот, зусім невыпадкова праз дзевяноста гадоў, у пачатку іншага стагоддзя, у абсалютна другіх сацыяльна-эканамічных умовах паўстала патрэба яшчэ раз звярнуцца да нейкага незвычайнага, лёсавызначальнага патэнцыялу скарочанай назвы «Інбелкульт»? Калі яшчэ раз узгадаць Л. Гумілёва, то выкарыстоўваючы яго ключавы канцэпт гістарычнай пасіянарнасці, можна выказаць меркаванне, што тут спрацаваў прынцып «як ты лодку назавеш, так яна і паплыве». Магчыма, Міністэрства культуры меркавала, што і сучасны Інбелкульт зможа праз пэўны час заняць важнае месца ў сферы каардынацыі перспектыў культурнага будаўніцтва ў Рэспубліцы Беларусь.

Зразумела, што самыя смелыя і нечаканыя інтэрпрэтацыі гістарычных тыпалогій заўсёды будуць недзе побач, але сапраўдная тайна падзеі застаецца прэрагатывай таго, хто стаяў каля яе вытокаў, таму загадзя разумеючы, што мая версія не з'яўляецца агульнапрынятым пастулатам, або меркаваннем, якое абапіраецца на дакументальна зафіксаваныя архіўныя матэрыялы, тым не менш, хачу прапанаваць свае разважанні адносна сучаснай актуалізацыі некалі навамоднага неалагізму.



На пачатку 20-х гадоў мінулага стагоддзя ў межах СССР была створана Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка. Гэтым крокам за беларускім этнасам замацоўвалася права самавызначэння, якое пазней праявілася ў розных формах статуснай інстытуалізацыі. Адным з найважнейшых праяўленняў беларускай дзяржаўнасці — і адпаведна права мець статус самастойнай рэспублікі ў складзе вялікай дзяржавы — было імкненне мясцовых рэспубліканскіх кіраўнікоў прадэманстраваць наяўнасць сваёй багатай гісторыі (найперш, прызнання фактару існавання дзяржаўнасці ў мінулым, а не бязроднага «Северо-Западного края»), нацыянальнай мовы (а не лакальна-спецыфічнага «русского наречия»), самабытнай культуры (а не культурных дыялектаў рускага, польскага обо балцкага кшталту), літаратуры (якая да таго часу мела шматвяковую гісторыю развіцця і дасягнула ўзроўню лепшых еўрапейскіх літаратур, каля вытокаў якой стаяў і наш першадрукар Ф. Скарына), мастацтва (якое ганарылася імёнамі беларусаў па паходжанні і школай віцебскіх творцаў, якія пазней загучалі на ўвесь свет), а таксама ўзнікненне адпаведнай навуковай школы, якая будзе даследаваць не толькі гістарычныя, культурныя, асветныя аспекты на шляху развіцця беларускага народа, але і шэраг кірункаў прыродазнаўчага характару. Да распрацоўкі шырокага спектра навуковых праблем былі запрошаны знакамітыя навукоўцы з Масквы і іншых даследчых цэнтраў Расіі. Кадравы патэнцыял супрацоўнікаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Інстытута беларускай культуры быў настолькі моцным, а даследаванні — маштабнымі і выніковымі, што праз зусім кароткі час для станаўлення самастойнай навуковай школы — у 1927 г. было вырашана на базе гэтай установы стварыць шэраг самастойных інстытутаў. Аднак самая галоўная гістарычная роля Інбелкульта была ў тым, што ён, як ніхто іншы, спрыяў нараджэнню беларускай дзяржаўнасці ўжо на сучасным этапе кансалідацыі нашага народа. Ён стаў своеасаблівым папярэднікам нашага сённяшняга суверэннага існавання. Калектыў апантаных навукоўцаў яскрава засведчыў, што на гэтай тэрыторыі жыве непаўторны народ, сфарміравалася нацыя, якая мае сваю мову, культуру, шматвяковыя традыцыі, звычаі, абрады, нацыянальнае адзенне, стравы, менталітэт, гістарычную спадчыну, якая прызнаецца суседзямі і сведчыць пра яе цесную суаднесенасць з іншымі еўрапейскімі народамі. І толькі ўжо пазней да гэтых сегментаў дзяржаўнага будаўніцтва далучылася прамысловасць і іншыя галіны эканамічнага гаспадарання.

Гісторыя распарадзілася так, што ў 1991 г. магутная Савецкая дзяржава зусім непрадказальна знікла з палітычнай карты свету і распалася на шэраг самастойных рэспублік. Як і многія іншыя народы, якія мелі свае дзяржаўныя фарміраванні, беларусы аказаліся сам-насам са сваім лёсам, палітычнымі, эканамічнымі, сацыяльнымі, культурнымі праблемамі. А ў такой складанай сацыякультурнай сітуацыі народ шукае надзейнае апірышча і знаходзіць яго найперш у тых адвечных каштоўнасцях, якія складваліся стагоддзямі, шанаваліся далёкімі продкамі і засталіся ў спадчыну як памяць не толькі аб сівой мінуўшчыне, але і ў шляху гістарычнага развіцця этнасу. Таму якраз у той час адбыўся моцны выплеск пасіянарнай энергіі, якая захоўвалася ў традыцыйнай народнай культуры, у сістэме каштоўнасцей хрысціянскай рэлігіі, у дзейнасці выбітных асоб, якія шмат у чым прадвызначалі развіццё гісторыі новага часу і фарміраванне беларускага прафесійнага мастацтва.

Таму, мяркую, стварэнне Беларускага дзяржаўнага інстытута праблем культуры было ў пэўнай ступені жаданнем вярнуцца да сітуацыі пачатку XX ст., калі зноў і зноў паўстала пытанне аб захаванні самабытнасці, непаўторнасці і самастойнасці, аднак яго заснавальнікам ці то не хапіла палітычнай волі і ідэалагічнага абгрунтавання, ці то яны пабаяліся, а хутчэй пасаромеліся (што больш характэрна для нашай ментальнасці) моцных гістарычных паралелей (хаця тыпалогія сітуацыі была даволі празрыстай) і ў пэўнай ступені амбіцыйнага пазіцыянавання, таму ўстанова атрымала не зусім выразную назву (зразумела,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

што фальклорны геній народа не абмінуў спалучэнне слоў «праблем культуры» сваім мастацкім пераасэнсаваннем). Пры гэтым акцэнт рабіўся і на неабходнасць «развядзення» назваў дзвюх адукацыйных устаноў: Мінскага, пазней Беларускага інстытута культуры і Беларускага дзяржаўнага інстытута праблем культуры (БелДІПК).

А вось калі прымалася рашэнне аб аднаўленні дзейнасці гэтай адукацыйнай установы на новым этапе, то назва яе была прадумана больш глыбока і са спасылкай на сучасную гісторыю краіны. Застаецца патлумачыць толькі мажлівы парадокс неадпаведнасці поўнай і скарочанай назваў інстытута. Аднак думаецца, што ў акрэсленай адсутнасці прамога калькіравання бачыцца не столькі гістарычная недакладнасць, колькі дынаміка развіцця інстытуцый, непасрэдна звязаных з дыяхронным асэнсаваннем гісторыка-культурнай спадчыны і змяшчэння акцэнтаў у разуменні Беларусі не толькі як монаэтнічнай дзяржавы з выразным прэваліраваннем тытульнага этнасу, а поліэтнічнай супольнасці, якая фарміравалася на скрыжаванні еўрапейскіх эканамічных, гістарычных і культуральных сілавых ліній.



Калі напрыканцы мінулага стагоддзя была распачата актыўная праца па рэалізацыі шматлікіх культурных праектаў пад эгідай ЮНЕСКА, сярод іх працэс рэстытуцыі (вяртання) колішніх гісторыка-культурных каштоўнасцей беларускага народа, а таксама прамой ці ўскоснай суаднесенасці з тэрытарыяльна-этнічным, прасторава-часавым кантынуумам, то ў міжнароднай супольнасці паўсталі заканамерныя пытанні (дарэчы, гэта праблема тычылася не толькі Беларусі) этнаідэнтыфікацыі і сутнаснага маркіравання суаднесенасці з адпаведнай краінай: а што лічыць уласна беларускім? Тое, што створана геніем тытульнага этнасу ці ўсяго народа ў цэлым, або пад увагу браць не столькі этнічную прыналежнасць, колькі тэрытарыяную суаднесенасць? Пытанне закранала і закранае шырокае кола спецыфічных праблем: паэт Адам Міцкевіч, які нарадзіўся на Навагрудчыне, а ўсе творы напісаў на польскай мове, — да чыёй культуры яго трэба аднесці? Тое ж самае і з Міхаілам Агінскім, са спадчынай Марка Шагала. Прыклады можна прыводзіць бясконца. На чыю навуковую спадчыну працуюць Жарэс Алфёраў, Пётр Клімук, Вячаслаў Сцёпін і многія іншыя прадстаўнікі беларускага народа, якія зараз працуюць за межамі роднай Беларусі. І вось тады было знойдзена хутчэй палітычнае, чым уласна навуковае рашэнне праблемы. Людзі, якія нарадзіліся на Беларусі, але не былі беларусамі па этнічнай прыналежнасці, пэўную частку жыцця працавалі на нашай зямлі, а затым воляю лёсу апынуліся ў іншых краінах, ці маюць яны

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дачыненне да культуры нашай краіны? Безумоўна! Таму і паўстала патрэба знайсці лагічнае выйсце з узнікшай сітуацыі. Адным з найбольш прадуктыўных шляхоў вырашэння абазначанай праблемы было пашырэнне прасторы даследуемай з'явы за кошт уліку ўсіх складовых кампанентаў культурнага жыцця рэспублікі. Калі гаворка ідзе аб *культуры беларускага народа як тытульнага этнасу краіны*, тады *мы гаворым пра беларускую культуру*, калі ж у цэнтры нашай увагі аказваюцца *духоўныя набыткі прадстаўнікоў іншых этнасаў*, якія пражываюць на Беларусі, тады мы *маем справу з культурай Беларусі*. Зразумела, што аб'ём паняцця «культура Беларусі» значна шырэй, чым паняцця «беларуская культура»: апошняя з'яўляецца толькі складовай часткай першай.

Такім чынам, эвалюцыя назвы ад «Інстытута беларускай культуры» да «Інстытута культуры Беларусі» адлюстроўвае тыя сацыякультурныя працэсы, якія адбываліся ў краіне на працягу XX ст., і зрухі ў грамадскім усведамленні народа як адзінай супольнасці розных этнасаў, якія жывуць на тэрыторыі Беларусі і пачуваюць сябе раўнапраўнымі прадстаўнікамі беларускага грамадства.



3. Інстытут культуры Беларусі ў сістэме адукацыйных і навуковых устаноў сферы культурнага будаўніцтва ў Рэспубліцы Беларусь

Стварэнне Інстытута культуры Беларусі суправаджалася вызначэннем пэўнага спектра функцый, акрэсліваннем прыярытэтных кірункаў яго дзейнасці. Аднак для таго, каб зразумець пачатковую ідэю аднаўлення/абнаўлення адукацыйнай установы, неабходна контурна прадставіць тую сістэму іншых адукацыйных устаноў, якія на той час ужо існавалі ў рэспубліцы і выконвалі адпаведныя функцыі, кожная па-свойму запаўняючы сацыякультурныя нішы-сегменты ў культурным будаўніцтве краіны.

На працягу другой паловы XX ст. была сфарміравана структура дзяржаўных устаноў, якія займаліся даследаваннем матэрыяльнай і нематэрыяльнай культурнай спадчыны беларускага народа, падрыхтоўкай высокакваліфікаваных спецыялістаў і дадатковай адукацыяй дарослых. Інтстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы НАН Беларусі, які быў створаны ў 1957 г., праводзіў фундаментальныя навуковыя даследаванні шматвяковай этнакультурнай спадчыны ў дыяхронным — *рэтраспектыўным* — аспекце (станаўленне,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

асноўныя этапы фарміравання беларускага этнасу, абрадавыя практыкі каляндарнай і сямейна-родавай накіраванасці, даследаванне асобных жанраў беларускага фальклору). Галіновыя ВНУ сферы культуры (Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі, Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў) рыхтуюць кваліфікаваныя кадры, якія павінны забяспечваць аптымальнае існаванне шырокага спектра ўстаноў культуры Беларусі. У плане сацыякультурнай прагматыкі яны выконвалі функцыю *трансляцыі*. Беларускі інстытут праблем культуры замыкаў адукацыйную піраміду, займаючыся павышэннем кваліфікацыі кадраў. Адначасова ён распрацоўваў і пэўныя навукова-даследчыя праекты, звязаныя з беларускай традыцыйнай культурай і прафесійным мастацтвам Беларусі. Другім важным кірункам дзейнасці Інстытута было забеспячэнне навукова-метадычнай і статыстычна-аналітычнай дзейнасці галіновага міністэрства. Зразумела, што менавіта гэтыя прынцыпова важныя функцыі павінны былі захавацца і за аднoўленым Інстытутам культуры Беларусі. Аднак той, хто ведае Кодэкс аб адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь, тут жа ўбачыць пэўную супярэчлівасць: ці можа адна і тая ж установа выконваць дзве зусім розныя функцыі? Калі ў назве Інстытута і ў яго статуце прапісана як асноватворная функцыя адукацыйнай установы, то ў такім разе яна павінна займацца толькі дадатковай адукацыяй дарослых (павышэннем кваліфікацыі і перападрыхтоўкай кадраў для сферы культуры). Разам з тым, улічваючы складаную эканамічную сітуацыю, пастановай Ураду прадугледжвалася выкананне Інбелкультам і функцый галіновага інстытута.

Менавіта з гэтага метадалагічнага дыскурсу і павінны выбудоўвацца роля і месца Інстытута культуры Беларусі ў галіновай сферы. Неабходна заўважыць, што сфера адукацыі яшчэ напрыканцы XX ст. прыняла адпаведныя захады і скарэкціравала ідэалогію паслядыпломнай адукацыі ў рэчышча апераджальнага развіцця галіны. У гэтым выпадку сістэма павышэння кваліфікацыі змяніла свае акцэнты: разам з тым, што яна дапамагала настаўнікам пастаянна падтрымліваць веды на адпаведным сітуацыі навуковага асэнсавання рэчаіснасці ўзроўні, але імкнулася прадчуваць рынак адукацыйных паслуг на бліжэйшую перпектыву і адначасова з павышэннем кваліфікацыі арганізоўвала перападрыхтоўку спецыялістаў. З кожным годам такая тэндэнцыя будзе пашырацца і паскараць зменлівасць сацыякультурнай жанравай мазаікі.

Прыярытэты ў кірунку развіцця сацыякультурнай сферы вымагаюць прынцыповай змены ў вызначэнні стратэгій дзейнасці Інстытута куль-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

туры Беларусі. Ён павінен не проста канстатаваць становішча ў адпаведнай галіне дзяржаўнага будаўніцтва (функцыя статыстычнага сканіравання), а *займацца пытаннямі стратэгіі развіцця галіны на бліжэйшую перспектыву (прагнастычная функцыя).*

4. Асноўныя кірункі дзейнасці і прыярытэты развіцця

*4.1. Метадалагічныя аспекты сацыякультурнай дзейнасці. Сацыядынаміка культурнага будаўніцтва*

У структуры Інстытута існуе шэраг аддзелаў, якія займаюцца вывучэннем праблем *сацыялогіі культуры, эканамічна-прававых аспектаў развіцця культурнай сферы дзяржаўнага будаўніцтва*, якія ахопліваюць асноўныя віды дзейнасці, спектр паслуг, *прагназавання* развіцця асноўных кірункаў галіны культуры. Апошняе дапаможа пастаянна падтрымліваць дынамічны баланс суаднесенасці паміж класіфікатарам спецыяльнасцей і спектрам спецыяльнасцей у галіне адукацыйных паслуг у сферы культуры. Вынік такога апераджальнага мыслення — прынцыповае змяшчэнне акцэнтаў у сферы сацыякультурнай дзейнасці: яна перастане выконваць некалі табуіраваную культурна-асветніцкую функцыю (культасветработа), а стане генератарам спектра духоўных запатрабаванняў сучаснага неафіта і адначасова аказання паслуг у сферы культурнай дзейнасці для ўсіх слаёў насельніцтва. Асабліва актуальнай уяўляецца гэта праблема для існавання такіх новых сацыяльна-тэрытарыяльных феноменаў, як аграгарадкі. Хаця, хутчэй за ўсё, нешта падобнае ў нашай гісторыі ўжо было, толькі яно было ўпісана ў традыцыю пад назвай «мястэчкі».

На мой погляд, сёння як ніколі нам неабходны мабільныя сацыялагічныя даследаванні функцыянавання галіны культуры і яе адпаведных устаноў. Праведзеныя зрэзы дапамогуць зразумець ролю і месца, скажам, тэатраў і музеяў у жыцці гараджан або клубных устаноў у жыцці сельскага насельніцтва. Нам патрэбна ведаць, якім чынам насельніцтва рэагуе на навацыі ў галіне музейнай педагогікі. Патрэбны вельмі дакладныя зрэзы па рэгіёнах, гарадах з рознай колькасцю насельніцтва аб рэакцыі наведвальнікаў клубных устаноў на пастаяннае пашырэнне кола платных паслуг.

Вельмі важнай праблемай з’яўляецца развіццё партнёрскіх адносін з установамі іншых ведамстваў, наладжванне работы апякунскіх саветаў, развіццё сістэмы спонсарскай дапамогі на распрацоўку найбольш

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

актуальных, запатрабаваных жыццём праектаў. А з гэтага сегмента культурнага будаўніцтва непасрэдна вынікае праблема захавання аўтарскіх правоў на інтэлектуальную ўласнасць. Наш Інстытут правёў на працягу 2012 г. некалькі семінараў па гэтай праблематыцы. Яны былі надзвычай плённымі і высвецілі шмат нюансаў прававога забеспячэння працы творчых работнікаў сферы культуры.

*4.2. Традыцыйная культура беларускага народа: дзяржаўны клопат аб захаванні і міжнародныя праекты падтрымкі і развіцця*

На мой погляд, надзвычай плённа разгортваецца праца ў кірунку захавання гісторыка-культурных каштоўнасцей Беларусі. З аднаго боку, фарміруецца Нацыянальны інвентар каштоўнасцей матэрыяльнай культуры, які на сённяшні час складае каля 79 адзінак, а з другога, распачалася сістэмная праца па стварэнні Нацыянальнага інвентара элементаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны. Супрацоўнікі Інстытута праводзяць цыклавыя семінары па ўсіх абласцях краіны з мэтай выпрацоўкі метадалогіі і методыкі выяўлення, навуковай фіксацыі, абгрунтавання, вызначэння кола носьбітаў і рэгіёнаў існавання, падрыхтоўкі партфоліа і прадстаўлення яго на разгляд спецыяльнай камісіі. Трэба адзначыць, што вопыт дзейнасці ў згаданым кірунку прызнаны адпаведнай камісіяй ЮНЕСКА, арганізацыяй ЕўрАзЭС. Перакананы, што такі вопыт дазволіць прыстойна прэзентаваць духоўную спадчыну беларускага народа сусветнай супольнасці і адначасова падтрымаць рэгіёны Беларусі з боку дзяржавы менавіта па збіранню, ахове, захаванню і міжпакаленнай пераемнасці фальклорна-этнаграфічнай спадчыны.



*4.3. Павышэнне кваліфікацыі і перападрыхтоўка кадраў у сферы культуры*

Гэта функцыя надзвычай важная і адказная. Але, пакуль што на яе глядзяць як на факультатыўную. На самой жа справе функцыя павышэння кваліфікацыі самым непасрэдным чынам звязана з засваеннем тэарэтычных ведаў у галіне гісторыі і тэорыі культуры і з дзейнасцю Міністэрства культуры як ідэалагічнага органа ўлады і кіравання адпаведнай галіной дзяржаўнага будаўніцтва. У дадзеным выпадку *Інстытут здольны* выконваць дваістую ролю. З аднаго боку, ён павінен *трансліраваць заканадаўчыя, сацыяльна-эканамічныя і прававыя*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*ініцыятывы Міністэрства культуры ва ўсе рэгіёны Беларусі і дапамагаць адаптаваць іх да канкрэтных жыццёвых рэалій.* З другога — праз сістэму базавых і праблемных курсаў, а таксама праз цыкл мерапрыемстваў міжкурсавой вучобы — семінараў і «круглых сталоў» — *Інстытут павінен абагульняць рэгіянальны вопыт рэалізацыі інавацыйных праектаў і рыхтаваць для Міністэрства аналітычныя матэрыялы рэфлексійнага і прагнастычнага характару.*

У сучаснай сістэме павышэння кваліфікацыі існуе адзін парадокс. Кожны спецыяліст павінен абавязкова прайсці павышэнне кваліфікацыі адзін раз у пяць гадоў. Але ж мы ведаем, што ў наш час інфармацыйнае поле любой сферы жыццядзейнасці грамадства і дзяржавы абнаўляецца значна хутчэй. Менавіта таму мы шмат увагі ўдзяляем міжкурсавым мерапрыемствам, якія ў значнай ступені павінны выконваць своеасаблівую кампенсаторную ролю.

Ключавая стратэгія прагназавання развіцця асноўных кірункаў у сферы культуры дазволіць прынцыпова змяніць змест і структуру ў дзейнасці сістэмы дадатковай адукацыі дарослых і перападрыхтоўкі кадраў. Пры гэтым павышэнне кваліфікацыі павінна зыходзіць не з наяўнасці спецыялістаў па той або іншай праблеме, а з улікам запытаў слухачоў, інтарэсаў рэгіёнаў.

*4.3.1. Метадычны кірунак* работы з'яўляецца адным з найбольш прыярытэтных, таму што ён прызначаны выконваць трансляцыйную ролю паміж навукоўцамі і непасрэднымі арганізатарамі сацыякультурнай дзейнасці. Пры гэтым неабходна адмовіцца ад распрацоўкі асобных сцэнарыяў, таму што яны даўно сталі правакаваць уніфікацыю абрадавай практыкі і прывялі да нівеліроўкі рэгіянальных і лакальных асаблівасцей традыцыйнай культуры, а таксама спрыялі ўзнікненню т. зв. «інавацыйных» форм мастацкай дзейнасці, пазбаўленых дакладнай сувязі з гісторыка-культурнай спадчынай рэгіёна. Таму метадычную работу пажадана скіраваць на распрацоўку навукова-метадычных комплексаў, у склад якіх уваходзілі б палявыя фальклорна-этнаграфічныя матэрыялы, матэрыялы фота- і відэафіксацыі, гістарычны аналіз разглядаемай з'явы, сцэнарны план каляндарнай абрадавай дзеі.

*4.3.2. Каардынацыя метадычнай дзейнасці.*

Формы рэалізацыі метадычнай работы могуць быць надзвычай шматпланавымі: праблемныя «круглыя сталы», тэматычныя семінары, майстар-класы, трэнінгі, канферэнцыі. Пры гэтым пажадана зрабіць пэўны акцэнт на замацаванне за кожным абласным метадычным цэнтрам яго прыярытэтных кірункаў дзейнасці. Абласны метадычны цэнтр



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

становіцца своеасаблівым філіялам Інстытута і адначасова эксперыментальнай пляцоўкай для рэалізацыі адпаведных пілотных праектаў у сферы культурнай дзейнасці. Гэты аспект дзейнасці патрабуе новага падыходу да вырашэння праблем кадравага патэнцыялу абласных метадычных цэнтраў. На падставе дзейнасці Каардынацыйнага савета ў ІМЭФ НАН Беларусі неабходна распачаць *мэтавую падрыхтоўку кандыдатаў навук па розных напрамках дзейнасці для абласных метадычных цэнтраў,* і тады можна будзе надаць ім статус навукова-метадычных цэнтраў.

У сваю чаргу Інстытут зможа стаць не толькі транслятарам праграмных дакументаў Міністэрства культуры, але яшчэ і своеасаблівым Клубам дырэктараў абласных метадычных цэнтраў. Калі Савет дырэктараў прызваны выконваць функцыю каардынацыйнага органа, то Клуб будзе скіраваны на прэзентацыю назапашанага рэгіянальнага вопыту.

Ужо сёння аддзел традыцыйнай культуры Інбелкульта падрыхтаваў і паспяхова правёў Міжнародную навукова-практычную канферэнцыю ў межах Міжнароднага форуму «Традыцыйная культура як стратэгічны фактар устойлівага развіцця грамадства» ў Магілёве. Потым мы прынялі ўдзел у міжнародным семінары ў Ганцавічах і Пінску па праблемах сучаснага развіцця традыцыйных народных промыслаў. Зараз завяршаецца праца над выпрацоўкай канцэпцыі вянка рэгіянальных фестываляў па традыцыйнай культуры Беларусі, мэта якога паказаць шырокай грамадскасці ўсю палітру жанраў, відаў і форм той шматвяковай спадчыны, якая засталася ад продкаў і якая дбайна захоўваецца сучасным пакаленнем носьбітаў.



### 4.4. Каардынацыя дзейнасці ўстаноў адукацыі ў сферы культуры

У адпаведнасці з Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі нарматыўнае забеспячэнне ўстаноў адукацыі галіны замацавана за Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь. Гэтыя функцыі сёння выконвае адзіны ў рэспубліцы аддзел вучэбна-метадычнага забеспячэння ўстаноў адукацыі сферы культуры. У яго рабоце выразна акрэслены тры асноўныя кірункі: вучэбна-метадычная дзейнасць, арганізацыйна-творчая і інфармацыйна-аналітычная.

Аддзел займаецца вучэбна-метадычным забеспячэннем адукацыйнага працэсу 523 дзіцячых школ мастацтваў (па 7 кірунках дзейнасці) і 21 установы сярэдняй спецыяльнай адукацыі (па 28 спецыяльнасцях

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і 10 спецыялізацыях з агульным аб’ёмам больш за 500 вучэбных дысцыплін).

Акрамя пытанняў зместу навучання і яго метадычнага забеспячэння аддзел выконвае функцыі каардынацыйнага рэспубліканскага цэнтра паміж адукацыйнымі сістэмамі (Міністэрства адукацыі і Міністэрства культуры) і ўстановамі адукацыі сферы культуры, удзельнічае ў распрацоўцы нарматыўнай прававой базы сістэмы мастацкай адукацыі, арганізуе «круглыя сталы», семінары, інавацыйна-навучальныя курсы, канферэнцыі і ўкараняе перадавы педагагічны вопыт і інавацыйныя методыкі выкладання, дыягнастуе якасць падрыхтоўкі спецыялістаў для сферы культуры.

4.5. Развіццё міжнародных сувязей

Адным з прыярытэтных кірункаў дзейнасці Інбелкульта з’яўляецца наладжванне актыўных міжнародных стасункаў. Прычым гэта павінен быць цэлы веер рознанакіраваных дзеянняў. Ён паступова набывае акрэсленыя рысы.

1. Бадай што на першае месца неабходна паставіць вектар рэалізацыі праектаў, прадугледжаных Дзяржаўнай праграмай «Культура Беларусі», у якой запланавана адкрыццё беларускіх культурніцкіх цэнтраў у Расіі, Украіне, Латвіі, Літве, Германіі. Сёння ёсць усе перадумовы стварэння такіх цэнтраў у Венгрыі, Боне, Японіі, ЗША.

2. З прыходам у Інбелкульт доктара філалагічных навук, прафесара А. І. Мальдзіса мы аднавілі працу па фарміраванню ўніверсальнай базы даных аб беларусах замежжа і рэстытуцыі гісторыка-культурных каштоўнасцей. Найбольш актыўна вядзецца праца з беларускімі суполкамі, якія знаходзяцца ў Расіі, краінах Балтыі, Польшчы. Мы дамовіліся аб тым, што будзем праводзіць сумесныя семінары, майстар-класы, фальклорныя вандроўкі, а сабраныя матэрыялы змяшчаць у навукова-практычным часопісе «Веснік Інстытута культуры Беларусі».

Гэты кірунак дзейнасці можа мець два вектары развіцця. З аднаго боку, назапашванне інфармацыі аб знаходжанні каштоўнасцей гісторыка-культурнай спадчыны беларускага народа ў замежжы, што будзе спрыяць стварэнню аб’ектыўнай карціны культурнага патэнцыялу народа не толькі ў гісторыка-культурным плане, але і ў плане аднаўлення статусу культурнай прэзентабельнасці розных слаёў грамадства і розных этнасаў, якія пражывалі ў межах краіны. З другога боку, нам неабходна шырокая папулярызацыя здабыткаў нацыянальнай культуры



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

па-за межамі Беларусі з мэтай маштабнага ўключэння ў кола міжнародных турыстычных сувязей, пошуку магчымасцей інвесціравання замежных капіталаў у развіццё сацыякультурнай сферы рэспублікі.

3. На сённяшні дзень Інстытут культуры Беларусі цесна супрацоўнічае з Польскім Інстытутам і Інстытутам Гётэ, наладжваюцца стасункі з Расійскім цэнтрам навукі і культуры, пасольствам Ісламскай Рэспублікі Іран, Навукова-метадычным цэнтрам культуралогіі Азербайджанскай Рэспублікі. Разглядаецца пытанне аб падпісанні дагавора з Расійскім дзяржаўным Домам народнай творчасці з мэтай правядзення замежных стажыровак спецыялістаў Інстытута, а таксама выкарыстання патэнцыялу расійскіх спецыялістаў у навучальным працэсе Інбелкульта.

Хочацца быць упэўненым у тым, што з цягам часу Інстытут культуры Беларусі стане ўплывовай установай у грамадскім жыцці рэспублікі і прыцягальным навукова-творчым і навукова-метадычным цэнтрам, працаваць у якім будуць лічыць за гонар самыя выбітныя знаўцы і творцы беларускай культуры.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ